Мы давали ребятам задание, чтобы они докладывали, не ходят ли незнакомые по деревне. Как-то раз бежит Вася ко мне и говорит: «Один человек спрашивал дорогу на Лусково». Мы научили их, как в следующий раз действовать. Когда этот человек появился снова, один из ребят побежал нас предупредить, другой направил его прямо на нашу засаду. Мы и взяли незнакомца. Привели в хату, стали обыскивать. В томе книги «Война и мир», которая была при нем, видим - на чистых местах, между главами, записи: и о месторасположении отряда, и о том, в каком доме в Гаянах останавливается партизанский командир. Доставили мы его в отряд - дело серьезное. И выяснилось, что нам попался самый настоящий шпион, завербованный англичанами еще до войны. Немецким оккупантам он сам предложил услуги. Более того, этого Юрашкевича, доцента, который до войны преподавал в Комвузе, узнал начальник особого отдела отряда. Шпиона отправили в бригаду, им заинтересовалась Москва. Его усиленно охраняли, но он не раз пытался бежать, и при попытке к бегству был убит. После войны жена Юрашкевича доказывала, что он был в партизанах. Она могла и не знать, что он был шпионом. И у нас в БГУ на кафедре белорусского языка была его книга, по ней учились студенты.

Конечно, были лазутчики, которых мы не обнаружили. В блокаду, помню, самолет бомбит лес, и - раз! - взлетает ракета, значит, кто-то ему сигналит.

Я пережила с товарищами по отряду три блокады. Первую - легко, вторая была короткая, а третья, перед самым освобождением, оказалась самой тяжелой: и кони тонули, и люди гибли во время обстрелов, когда шли на прорыв.

Война для нас кончилась внезапно. Мы вышли из блокады, я с кого-то допрос снимала, и тут стали слышны залпы. Этот человек прислушался и говорит: «Это ж наша "катюша"!» Так оно и оказалось. Скоро мы все двинулись маршем в Минск. Пришли в Лошицу пешком (а это километров 25) и там стали готовиться к параду.

Мне нечем особо гордиться: столько людей погибло, а я осталась жива... Мы все стремились к борьбе и очень жаль, что не хватало опыта, осторожности. Но сколько добра от людей, от сельчан я во время войны видела! С тех пор и чувствую себя частью своего народа. Может, это и дает мне силы жить. Плохое, наносное есть всюду. Но разве это главное?

Какие бы ни были наши годы - надо жить в ногу со временем, нужно становиться с годами мудрее, добрее, терпимее.

Поступила в редакцию 21.04.05.

*В.В. КАЗЛОВА*

## ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА Ў ЛЁСЕ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XX ст.



*Вольга Васільеўна Казлова* - кандидат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры. Заслужены работнік вышэйшай школы. Узнагароджана трыма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, медалямі.

У двары галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага універсітэта, непадалёку ад бронзавых помнікаў славутым людзям нашай зямлі Еўфрасінні Полацкай, Кірылу Тураўскаму, Міколу Гусоўскаму, Францыску Скарыне, Сымону Буднаму, Васілю Цяпінскаму замаскіраваны зелянінай стаіць сціплы з бетону і крошкі знак-сімвал памяці студэнтам і выкладчыкам універсітэта - удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны (ВАВ). Ідэйны змест помніка ўвасоблены праз мастацкую дэталь - салдацкая вінтоўка са штыком уціснута ў расколіну ромба. Дэталь «зброі» навяла мяне на думку расказачь аб воінах, у чыіх руках была яна, якой мэце служыла і якімі шляхамі калектыў кафедры беларускай літаратуры XX ст. БДУ ішоў да Перамогі.

Цяжка ўспамінаць спякотную нядзелю 22 чэрвеня 1941 г. Вайна грымнула нечакана для насельніцтва савецкай дзяржавы. Выхаваныя вайсковай дактрынай даваеннага часу, мы былі перакананы, што калі давядзецца ваяваць, то толькі на чужой тэрыторыі. Першы шквал бомбавых удараў фашысцкага агрэсара абрушыўся на Мінск, у тым ліку на чыгуначны вузел, на вакзал І на суседні з ім універсітэцкі гарадок. Арганізаванай эвакуацыі БДУ не атрымалася. Студэнт філфака Іван Кудраўцаў у сваіх пісьменніцкіх успамінах пісаў аб сумесных мытарствах-вандраваннях з рэктарам БДУ Парфенам Пятровічам Савіцкім па прыфрантавых раёнах Беларусі і Расіі. Бежанцы і эвакуіраваныя беларусы, як зярняткі са спелага коласа, рассыпаліся па велізарнай тэрыторыі дзяржавы, розных франтах і партызанскіх злучэннях.

2 чэрвеня 1942 г. Бюро ЦК КП(б)Б разглядала на сваім пасяджэнні ў Маскве пытанне аб аднаўленні БДУ і звярнулася за падтрымкай да ўрада СССР. 15 мая 1943 г. СНК СССР прыняў пастанову «Аб аднаўленні работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта». Дзякуючы клопатам урада БССР І матэрыяльнай дапамозе Штаба партызанскага руху Беларусі ў кастрычніку месяцы на станцыі Сходня пад Масквой у драўляным памяшканні былой школы расчыніліся дзверы для студэнтаў і выкладчыкаў БДУ.

Пачалося ўзнаўленне работы вышэйшай навучальнай установы. Вестка аб гэтых падзеях ускалыхнула насельніцтва як на прасторах Саюза, так і ў акупіраванай ворагам Беларусі. Рэктару БДУ П.П. Савіцкаму была даручана справа дзяржаўнай важнасці. Яго арганізатарскія здольнасці, набытыя на гаспадарчай мірнай працы і памножаныя на дальнабачнасць, камунікабельнасць, працоўную самаадданасць, дазволілі яму ў кароткі тэрмін двухпавярховую драўляную прыгарадную школу Падмаскоўя ператварыць у будынак для 300 чалавек.

Адным з першых франтавікоў пасля цяжкага ранения і працяглых гаспітальных лекаў усклаў на сябе абавязкі дэкана філалагічнага факультэта, загадчыка кафедры беларускай мовы і літаратуры капітан савецкай арміі Міхась Рыгоравіч Ларчанка, былы старшы навуковы супрацоўнік Акадэміі навук БССР. Не залячыўшы раны, хаваючы ад студэнтаў свае фізічныя нядугі, не акцэнтуючы ўвагу на роздумах аб лёсе сям'і, што засталася на акупіраванай ворагам тэрыторыі, Міхась Рыгоравіч пачаў збіраць кагорту студэнтаў, раскіданых па тэрыторыі Савецкага Саюза. М.Р. Ларчанка быў надзелены выразнай нацыянальнай ментальнасцю. Кожнага, хто пераступаў парог яго сціплага кабінета, ён сустракаў добразычлівай усмешкай, уважліва ставіўся да просьбаў, прапаноўваў парады-паслугі. Міхась Рыгоравіч хораша чытаў лекцыі па ўсіх перыядах гісторыі беларускай літаратуры, быццам бы вёў студэнтаў па шляхах мінулага Беларусі, адчыняў ім духоўныя скарбонкі свайго народа.

У час вайны М.Р. Ларчанка, карыстаючыся архівамі і бібліятэкамі Масквы, нарыхтоўваў матэрыялы для навуковых даследчых прац, прысвечаных ідэям славянскай супольнасці, братэрству і адзінству народаў, заклаў асновы сваёй навуковай школы, з якой выйшлі знакамітыя людзі Беларусі. Словы ўдзячнасці і прызнання свайму настаўніку яны выказалі ў зборніку «Імёнаў слаўнае аблічча», падрыхтаваным Алесем Бельскім. М.Р. Ларчанка за баявыя заслугі быў адзначаны шматлікімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Сярод іх у музеі факультэта ёсць медалі «50 год Узброеных Сіл СССР» і «60 год Узброеных Сіл СССР».

У калектыве БДУ вылучаўся Іван Васільевіч Гутараў - бранскі партызан, маёр Узброеных Сіл СССР, на тую пару выкладчык кафедры рускай літаратуры. Ён зачароўваў студэнтаў энцыкпапедычнымі ведамі, методыкай выкладання, творчымі сустрэчамі і сяброўскімі сувязямі з рускімі пісьменнікамі А. Фадзеевым, М. Шолахавым, Ф. Панфёравым і інш. Іван Васільевіч у час вайны чытаў лекцыі наездамі з партызанскага краю, узначальваў партыйную арганізацыю Саюза пісьменнікаў СССР. Ён абараніў доктарскую дысертацыю, у якой даследаваў арсенал сродкаў вуснай народнай творчасці, матэрыялы партызанскага друку, якія служылі мсціўцам зброяй у барацьбе з акупантамі, вызначыў жыццесцвярджальную сілу, духоўнае і творчае багацце беларускага народа перыяду вайны. У Дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны Рэспублікі Беларусь экспануюцца яго цікавыя дакументы і ўзнагароды, а сярод іх самыя высокія - ордэны Леніна і

Чырвонага Сцяга, якімі ён быў адзначаны за ўдзел у партызанскай барацьбе з акупантамі.

Да плеяды франтавікоў-адраджэнцаў БДУ таксама належыць Іван Паўлавіч Мележ. Хмара вайны навісла над ім у час вайсковай службы ў Закарпацці. І.П. Мележ зведаў горыч адступлення, прайшоў праз жорсткія баі, быў двойчы цяжка паранены і пасля доўгага лячэння адпраўлены ў тыл. Прачытаўшы звестку аб аднаўленні працы БДУ, хутка праклаў да яго шляхі і быў залічаны студэнтам для завяршэння адукацыі, якую распачаў у 1939 г. у Маскоўскім інстытуце гісторыі, філасофіі і літаратуры. Адначасова ён выкладаў ваенную справу. Пад яго камандаваннем і мне давялося асвойваць курс маладога байца. Зімою Іван Паўлавіч, нягледзячы на холад у памяшканні класа-аўдыторыі, выкладаў студэнтам (сярод якіх былі ў асноўным дзяўчаты) курс розных вайсковых статутаў, тлумачыў стратэгію і тактыку вермахта. Як толькі прыгрэла сонейка, І.П. Мележ павёў сваё дзявочае войска на муражок, дзе мы пачалі займацца страявой падрыхтоўкай. Дзяўчаты стараліся бездакорна выконваць усе каманды. Канфузы здараліся толькі з камандамі «Кругом!» і «Бягом!». Ногі, абутыя ў рознага памеру калёшы, валёнкі, дабітыя салдацкія боты, атопкі, не заўсёды падпарадкоўваліся камандзе, і студэнткі ружавелі ад сваёй «вайсковай» нязграбнасці. Лейтэнант І.П. Мележ сваёю далікатнай манерай паводзін, усмешлівым добразычлівым позіркам трымаў у палоне ўсю тагачасную універсітэцкую жаночую рацыю, але да пары - да прыезду яго маладой жонкі, прыгажуні з немаўляткам-дачушкай.

Пасля вяртання БДУ ў Мінск мы разам з Іванам Паўлавічам сустрэлі Перамогу. Народны пісьменнік Беларусі, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій доўгі час працаваў на кафедры беларускай літаратуры XX ст. У склад гэтай кафедры пэўны час уваходзілі выкладчыкі мовы, і адзін з іх - Міхал Іванавіч Жыркевіч, дэмабілізаваны па хваробе і ўзросце. Вялікі вопыт жыцця ён імкнуўся перадаць моладзі праз розныя практычныя парады. Знешне патрабавальны, а ў душы клапатлівы, як бацька, Міхал Іванавіч аберагаў нас у час паездак на станцыю Хімкі для набыцця хлеба па картках для ўсяго універсітэта, а таксама ў час нарыхтоўкі лесу ў мясцовым лясніцтве для атаплення памяшкання. М.І. Жыркевіч вельмі даступна, сродкамі ўласнай методыкі адкрываў нам сакрэты беларускай арфаграфіі, агучваў мелодыю роднай беларускай мовы. Пасля Перамогі над фашысцкімі захопнікамі дацэнт, заслужаны дзеяч навукі М.І. Жыркевіч плённа, з вялікай аддачай узначальваў кафедру беларускай мовы і літаратуры. Яго вобраз як прататып знайшоў мастацкае ўвасабленне ў творчых працах вучняў Івана Курбекі, Рыгора Семашкевіча, Івана Кудраўцава і іншых.

Я паведала кароткія звесткі пра адраджэнцаў-выкладчыкаў першай філфакаўскай хвалі БДУ. Але ж была і другая, і трэцяя. Па біяграфіях членаў кафедры беларускай літаратуры XX ст. можна напісаць дакладную гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Так, разам з намі працаваў удзельнік Сталінградскай бітвы Леанід Антонавіч Царанкоў. Аднойчы, пасля чарговай сустрэчы са сваімі аднапалчанамі, уразіў нас падарункам: прывёз салдацкі кісет, абпалены ў час той бітвы і напоўнены зямлёй, перамешанай з металічным шротам. Высокай кваліфікацыі метадыст сярэдняй і вышэйшай школы сціплы Л.А. Царанкоў у падарунак новым пакаленням напісаў некалькі школьных падручнікаў, пакінуў шматлікія літаратуразнаўчыя працы, метадычныя распрацоўкі, пакпаў сваю цагліну ў падмурак п'едэстала Вялікай Перамогі на плошчы ў цэнтры Мінска.

Прадстаўнік другога ветэранскага пакалення Леў Міхайлавіч Шакун. Сваю вайсковую біяграфію пачаў падлеткам, прайшоў школу партызанскага руху, зведаў гераічнае і трагічнае ўсенароднай барацьбы з ворагам. Выхаванец інтэлігенцкага асяроддзя з сям'і настаўнікаў, ён пасля Перамогі абраў шлях умацавання роднай мовы, дарогу адраджэння гістарычных каранёў нацыянальнай культуры. Л.М. Шакун, прафесар, доктар навук, Заслужаны работнік вышэйшай школы, стварыў сваю лінгвістычную школу, якая плённа працуе на філалагічным факультэце, прызнана за рубяжом. Яго навуковая спадчына - залаты фонд філалагічнай навукі Рэспублікі Беларусь.

Партызанскі рух на Беларусі цесна пераплятаўся з барацьбой падпольшчыкаў. Дзве гэтыя плыні, напоўненныя народным гневам, і спрыялі барацьбе з

ворагам, у якой актыўны ўдзел прымаў Іван Якаўлевіч Навуменка - сёння ён акадэмік НАН Беларусі, Заслужаны дзеяч навукі, народны пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Яго юнацтва прайшло пад ветразем падпольнай дзейнасці па знішчэнню акупантаў. Грамадзянская сталасць Івана Якаўлевіча фарміравалася ў франтавых акопах на роднай і чужой землях. За баявыя заслугі ён узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

На пасадзе загадчыка кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта І.Я. Навуменка багата зрабіў для актывізацыі навуковай дзейнасці студэнтаў, прымаў удзел у стварэнні новых праграм па гісторыі літаратуры. Па літаратурнай творчасці Івана Якаўлевіча можна вывучаць біяграфію яго пакалення. Яго навуковая і творчая дзейнасць адзначана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалём Францыска Скарыны.

Шлях філфакаўцаў БДУ да Перамогі адлюстраваўся ў старонках жыцця Сцяпана Хусейнавіча Александровіча, якому давялося ваяваць на Каўказе ў складзе горна-стралковага вайсковага злучэння. У адной з баявых аперацый ён трапіў у палон. Выратавала салдацкая загартоўка, вера ў перамогу над фашысцкімі пачварамі. Сцяпан Александровіч знайшоў сілы і вырваўся з-за калючага дроту, адолеў цяжкі шлях па акупіраванай ворагам тэрыторыі і прадоўжыў барацьбу з фашыстамі ў асяроддзі партызан і падпольшчыкаў. Аб яго мужнасці сведчыць высокая ўзнагарода - ордэн Славы III ступені.

Сучаснае літаратуразнаўства з удзячнасцю чэрпае веды па гісторыі беларускай літаратуры, крытыцы, мастацтве з навуковых прац прафесара, доктара філалагічных навук, Заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь С.Х. Александровіча.

Адразу пасля дэмабілізацыі ў 1945 г. прыйшоў працаваць ва універсітэт франтавік Юліян Сяргеевіч Пшыркоў - сын слаўнай сялянскай сям'і, з якой выйшлі палкоўнік авіяцыі Піліп Сяргеевіч, капітан першага рангу Мікалай Сяргеевіч. Доктар філалагічных навук, прафесар Ю.С. Пшыркоў - выхаванец ленінградскай школы вучоных - у сваіх лекцыях і даследаваннях раскрыў ідэйна-эстэтычную глыбіню творчасці Я. Коласа, уклад песняра ў развіццё нацыянальнай літаратуры. Ю.С. Пшыркоў сабраў пад сваё крыло творчую моладзь, заснаваў навуковыя студэнцкія гурткі, падрыхтаваў вялікую кагорту выпускнікоў філфака для працы ў Акадэміі навук БССР.

Знаёмства з біяграфіямі ўдзельнікаў ВАВ, членамі кафедры беларускай літаратуры XX ст. сведчыць аб тым, што яны змагаліся на франтах, у партызанскіх злучэннях, трупах падпольшчыкаў. Сваімі ратнымі і працоўнымі подзвігамі яны наблізілі Дзень Перамогі, збераглі і памножылі духоўнае багацце нацыі, высока трымалі сцяг адзінства народаў СССР, умуравалі ў манумент Перамогі адшліфаваныя жорсткай вайной свае, нацыянальныя цагліны.

Паступіў у рэдакцыю 29.03.05.